# ПЕРАВАГІ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ АНКЕТ ДЛЯ МАНІТОРЫНГУ ДАСТУПНАСЦІ ТУРЫСЦКІХ АБ'ЕКТАЎ

**Жывалкоўская С.В.**

*Беларускі Дзяржаўны Універсітэт, Мінск;*
*sophzhivaalkovskaya@gmail.com; Н.М.Барысенка-Клепач, выкладчык*

У дадзеным артыкуле вызначана важнасць укаранення інклюзіўных падыходаў у турысцкім бізнесе, разгледжаныя асаблівасці агульных і спецыялізаваных анкет для маніторынгу даступнасці турысцкіх аб’ектаў. Мэтай артыкула з’яўляецца выяўленне недахопаў і пераваг як агульных, так і спецыялізаваных анкет. Праведзены аналіз анкет, і зробленыя аб’ектыўныя высновы аб перавагах спецыялізаваных анкет для маныторынгу даступнасці турысцкіх аб’ектаў. У артыкуле прадстаўленыя прапановы для больш эфектыўнага маніторынгу даступнасці аб’ектаў і, як вынік, – далейшага развіцця інклюзіўнага турызму ў Беларусі. Праца прызначана ў першую чаргу для студэнтаў, а таксама ўладальнікаў турысцкага бізнесу, якія жадаюць самастойна правесці ацэнку даступнасці свайго аб’екту.

***Ключавыя словы:*** Інклюзіўны турызм; маніторынг даступнасці; анкеты для маніторынгу даступнасці; даступнасць турысцкіх аб’ектаў; турысцкі бізнес.

# THE PREFERENCE OF SPECIALIZED QUESTIONNAIRES FOR MONITORING THE AVAILABILITY OF TOURISM FACILITIES

**Zhyvalkouskaya S.**

Belarusian State University, Minsk;
*sophzhivaalkovskaya@gmail.com; N. Barysenka-Klepach, senior lecturer*

This article shows the importance of implementation of inclusive approaches in tourism industry. It indicates features of general and specialized questionnaires for monitoring availability of tourist facilities. The purpose of the article is to identify the strengths and weaknesses of both general and specialized questionnaires. Here is presented the analysis of the questionnaires and objective conclusions about the benefits of the specialized questionnaires for monitoring the availability of tourist facilities. Article contains proposals for effective monitoring of the availability of facilities and, as a consequence - the further development of inclusive tourism in Belarus. The work is addressed for students, as well as the tourism entrepreneurs who want to self-assess the availability of theirs facilities.

***Keywords***: inclusive tourism; accessible tourism; availability monitoring; questionnaires for availability monitoring; availability of tourism facilities; tourism industry.

Згодна з фармулёўкай Сусветнай турысцкай арганізацыі (ЮНСТА), інклюзіўны турызм – гэта форма турызму, якая ўключае ў сябе працэс супрацоўніцтва паміж рознымі ўдзельнікамі сферы турызму, які дазваляе людзям з асаблівымі патрэбамі ў даступнасці, уключаючы мабільныя, візуальныя, слыхавыя і кагнітыўныя складнікі даступнасці, дзейнічаць незалежна, на роўных умовах з пачуццём уласнага гонару

праз прапанову універсальных турысцкіх прадуктаў, паслуг і асяроддзя [1].

Інклюзіўныя падыходы неабходны для развіцця беларускага турысцкага рынку, бо дазваляюць яму адпавядаць сусветным тэндэнцыям. На сучасным этапе ў Рэспубліцы Беларусь адбываецца фарміраванне інклюзіўнага турызму [2, с.1]. Паводле ацэнак шэрагу беларускіх экспертаў, у тым ліку прадстаўнікоў ГА «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-вазочнікаў», патэнцыйны попыт на інклюзіўны турызм складае да 26% усяго насельніцтва краіны [3, с.2]. Да 2020 года па прагнозах ЮНСТА інклюзіўны турызм складзе 22% усіх выдаткаў на турызм у свеце. Тым не менш, турысцкі бізнес Беларусі застаецца неадаптаваным да інклюзіўных патрэбаў. Асабліва актуальнымі даследаванні інклюзіўнага турызму робяцца ў свеце ратыфікацыі Беларуссю ў 2016 г. Канвенцыі ААН аб правах інвалідаў. Канстытуцыяй РБ заканадаўча замацавана, што ўсе грамадзяне маюць роўныя правы на адпачынак. Па стане на 2015 г. распрацавана, зацверджана і ўведзена ў дзеянне больш за 20 нарматыўна-прававых актаў, дзе так ці інакш закранаецца тэма фарміравання безбар'ернага асяроддзя [4, с.4]. Тым не менш, на сённяшні дзень немагчыма казаць аб даступнасці турызму для ўсіх катэгорый грамадзян.

Важнаць укаранення інклюзіўных падыходаў абумоўлена і надыходзячымі II Еўрапейскімі Гульнямі ў 2019 годзе, дзе спартыўныя і турысцкія аб’екты мусяць адпавядаць міжнародным стандартам.

У 2016-2017 гадах на базе студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі «Інавацыйныя тэхналогіі ў турызме» было праведзена даследаванне турысцкага рынку Беларусі па ступені яго гатоўнасці да ўкаранення інклюзіўных падыходаў. Вынікі даследавання былі накіраваны ў адрас Міністэрства спорту і турызму РБ. У межах даследавання было выяўлена, што асноўнымі катэгорыямі турыстаў, з якімі сутыкаецца беларускі турысцкі бізнес, з’яўляюцца:

- Бацькі з маленькімі дзецьмі (72,5%);
- Сталыя людзі (69,3%);
- Людзі з інваліднасцю (49,5%).

Пры тым, з выказваннем «даступнасць павышае канкурэнтаздольнасць турысцкага аб'екта» згодны 90,1% рэспандэнтаў. Варта адзначыць, што да 34,9% рэспандэнтаў гатовыя самастойна правесці ацэнку даступнасці аб’екта [4, с.18]. Зацікаўленасць у самастойнай ацэнцы даступнасці стварае неабходнасць у распрацоўцы дакладнага інструментарыя.

Напярэдадні Чэмпіяната свету па хакеі ў 2014 годзе АПУ «Офіс па правах людзей з інваліднасцю» была распрацавана агульная анкета для ацэнкі даступнасці аб’ектаў, якая складалася з 4 вялікіх блокаў: шляхі руху да аб’екта, стаянка, уваход у будынак і ўнутранае памяшканне. Праведзеныя ў 2014 і 2016 гг. ў г.Мінску маніторынгі даступнасці аб'ектаў турысцкай інфраструктуры паказалі, што толькі не больш за 15% ацэненых турысцкіх аб'ектаў адпавядаюць базавым патрабаванням даступнасці, замацаваным заканадаўствам РБ [4, с.7].

Аднак, існуючыя анкеты не ўлічвалі спецыфіку турысцкіх аб’ектаў, таму пазней было распрацавана 5 спецыялізаваных анкет для маніторынгу турысцкіх аб’ектаў розных тыпаў:

1. Месцаў для гледачоў;
2. Месцаў ў абедных залах;
3. Месцаў часовага пражывання;
4. Месцаў абслугоўвання;

5. Рэкрэацыйных прастор.

Спецыялізаваныя анкеты больш дакладна адлюстроўваюць даступнасць ці недаступнасць пэўнага аб’екта і накіраваны ў першую чаргу на большы ахоп аб’ектаў для аналізу. Пры гэтым яны прасцей за агульныя анкеты і складаюцца з 2 старонак супраць 5 у агульных анкетах.

Для ацэнкі эфектыўнасці быў праведзены SWOT-аналіз агульных і спецыялізаваных анкет, у выніку якога высветліліся перавагі спецыялізаваных анкет над агульнымі.

Да пераваг агульных анкет тычыцца ў першую чаргу іх універсальнасць і магчымасць прыстасаваць амаль да любога аб’екту, а таксама наяўнасць заканадаўчай базы, на аснове якой анкеты і былі распрацаваны. Тым не менш, адсутнасць спецыфікі і складанасць тэрміналогіі з’яўляюцца значнымі недахопамі, асабліва для ўладальнікаў бізнесу. Складанасць анкеты робіць яе выкарыстанне нязручным і можа выклікаць памылкі ў разліках.

На падставе SWOT-аналізу спецыялізаваных анкет была зроблена выснова, што асноўная перавага такіх анкет складаецца ў іх прастаце і ўліку спецыфікі месцаў, якія аналізіруюцца. Больш за тое, анкета «Рэкрэацыйныя прасторы» дазваляе правяраць даступнасць паркаў, сквераў і іншых месцаў для адпачынку, што было немагчыма ажыццявіць з дапамогай агульных анкет. Тым не менш, адсутнасць падрабязных заканадаўчых патрабаванняў да даступнасці такіх аб’ектаў з’яўляецца значным недахопам такіх анкет, што стварае неабходнасць удасканалення заканадаўства.

У 2017 годзе студэнтамі факультэта міжнародных адносін быў праведзены маніторынг даступнасці аб’ектаў з дапамогай як агульных, так і спецыялізаваных анкет. У межах маніторынгу было даследавана 8 аб’ектаў, сярод якіх толькі 1 (Галерэя У) быў прызнаны часткова даступным. Тым не менш, усімі ўдзельнікамі маніторынгу была адзначана большая прастата спецыялізаваных анкет над агульнымі, а таксама неабходнасць выкарыстання адначасова двух анкет для больш поўнага аналізу.

На падставе аналізу і маніторынгу, праведзенага студэнтамі, для падвышэння эфектыўнасці самастойнага маніторынгу даступнасці аб’ектаў былі распрацаваныя наступныя прапановы:

1. Ужыванне адначасова двух анкет;
2. Супрацоўніцтва з Міністэрствам спорта і турызму. Для большага ахопу аб’ектаў для маніторынгу патрэбны адміністратыўны рэсурс;
3. Удасканаленне заканадаўства;
4. Прасоўванне анкет сярод уладальнікаў турысцкага бізнесу;
5. Спрашчэнне тэрміналогіі ў агульнай анкеце, каб ёй маглі карыстацца уладальнікі бізнесу, якія не маюць спецыфічных ведаў;
6. Стварэнне інтэрактыўнай анлайн-мапы ці мабільнай прылады, куды ўладальнікі бізнесу маглі б занесці свае аб’екты. Гэта, па-першае, прастымулюе іх да маніторынгу аб’ектаў, а па-другое, дасць людзям з асаблівымі патрэбамі ўяўленне пра даступныя аб’екты ў Беларусі.

Такім чынам, відавочна перавага спецыялізаваных анкет над агульнымі, але для эфектыўнага маніторынгу даступнасці аб’ектаў неабходна ўжыванне адразу двух тыпаў анкет.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Darcy, S. TowardsaDefinitionofAccessibleTourism / [Электронный ресурс] / Accessible tourism research. – Режимдоступа: http://accessibletourismresearch.blogspot.com/2010/01/towardsdefinition-of-accessible.html. – Датадоступа: 02.04.2018.

2. Борисенко-Клепач, Н.М. Подходы к определению понятия «безбарьерный туризм» / Н.М. Борисенко-Клепач // Сборник научных статей студентов, магистрантов, аспирантов. Вып. 16 / сост. С. В. Анцух; под общ. ред. В. Г. Шадурского. — Минск: Четыре четверти, 2016. — с.279-281.

3. Борисенко-Клепач, Н.М. Перспективы развития безбарьерного туризма в Республике Беларусь / Н.М. Борисенко-Клепач // Беларусь в современном мире = Беларусь у сучасным свеце: материалы XV Международной конференции, 27 октября 2016 г. / редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. — Минск: Изд. центр БГУ, 2016. с.224-225.

4. Борисенко-Клепач Н. М., Глушакова А. Я., Живалковская С. В. / Степень готовности туристического рынка Беларуси к внедрению инклюзивных подходов : результаты исследования / Н. М. Борисенко-Клепач // БГУ, Фак. международных отношений, Каф. международного туризма, СНИЛ «Инновационные технологии в туризме». – Минск : БГУ, 2017. – 35 с. : ил. – Библиогр.: с. 30.